# ЖЫЦЦЯ ШЧАСЛІВАЕ ІМГНЕННЕ

**ВЯРЭЙКІ. Гэты рэпартаж можна аднесці адразу да некалькіх тэматычных рубрык: «Юбілеі», «Дзень роднай мовы». У абодвух выпадках гэта было б правільным. Падзея, якая адбылася 14 лютага ў Доме культуры аграгарадка Вярэйкі Ваўкавыскага раёна, мае непасрэднае дачыненне да нашага пісьменніцкага калектыву і такое ж – да штогадовага сусветнага свята. Тут справілі 70-гадовы юбілей члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэта Віктара Курловіча. Літаратурная імпрэза стала першым мерапрыемствам, якім быў дадзены старт святкаванню на Гродзеншчыне Сусветнага дня роднай мовы.**

Нарадзіўся наш калега 18 лютага. Сусветны дзень роднай мовы, як вядома, адзначаецца 21 лютага. Але хто сказаў, што святкаванню юбілеяў ды папулярных міжнародных святаў патрабуецца ідэальная каляндарная дакладнасць? Тым больш, што 14 лютага пэўная частка нашай аўдыторыі лічыць мэтазгодным адзначаць зусім іншае свята, якое калісьці, у недалёкім мінулым прыйшло да нас з Заходняй Еўропы. Адны святы прыходзяць; іншыя сыходзяць. Калі ў нашым жыцці ёсць месца для святаў, гэта добры знак. З’яўленне новых, пагадзіцеся, многімі з нас сустракаецца станоўча. А калі пры гэтым у нашым жыцці захоўваюцца і ранейшыя традыцыі – гэта радасна ўдвая. Калі хто-небудзь мае намер паспрачацца, прапануем



эксперымент – варыянт, які, спадзяемся, задаволіць усіх – зусім новае свята. А вось тое, якой назвы яно заслугоўвае, стане зразумела пасля знаёмства з яго зместам.

14 лютага ў малой зале Вярэйкаўскага ДК сабраліся мясцовыя жыхары, аматары мастацтва, прадстаўнікі розных пакаленняў – ветэраны працы, работнікі культуры, педагогі, вучні мясцовай сярэдняй школы, прадстаўнікі ўлады. На свята ў Вярэйкі завіталі літаратары – старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Людміла Кебіч; намеснік старшыні ГрАА СПБ, паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык (Гродна), а таксама член СПБ, паэт Мікалай Іваноўскі (Ваўкавыскі раён). Нагодай стала віншаванне з надыходзячым 70-гадовым юбілеем члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэта, перакладчыка Віктара Георгіевіча Курловіча *(на фота).* Першымі выступоўцамі сталі школьнікі. Юныя чытальнікі прадэкламавалі некалькі твораў Віктара Курловіча, напісаных ім у розныя гады, на розныя тэмы; пераважала грамадзянска-патрыятычная лірыка. Людміла Антонаўна Кебіч асабіста павіншавала юбіляра, уручыла падарункі і ўзнагароды: ганаровую грамату за плённую, шматгадовую грамадска-літаратурную дзейнасць ад кіраўніка Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Мікалаевіча Карлюкевіча і ганаровую грамату Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Дзмітрый Радзівончык зачытаў тэкст афіцыйнага віншавання юбіляру ад імя калектыву пісьменніцкай арганізацыі Прынёманскага краю. Урачыстую эстафету працягнуў зямляк і калега Віктара Георгіевіча, беларускі паэт Мікалай Пятровіч Іваноўскі з вёсачкі Пачуйкі. Кранальныя словы сардэчных сяброўскіх віншаванняў, шчырых, цёплых пажаданняў запалілі бліскучае святло радасці ў вачах прысутных. Парадаваў сяброў чытаннем уласнай паэзіі і сам юбіляр. Віктар Георгіевіч прысвяціў уласныя лірычныя радкі сакральнаму





вобразу малой радзімы – вёсачцы Драгічаны на Ваўкавышчыне, прадставіў нават некалькі новых твораў, якія яшчэ не былі апублікаваныя. Галоўнымі матывамі выступлення сталі любоў да роднага краю і людзей, бязмежная павага да сваіх вытокаў, да традыцый беларускага народнага жыцця, да роднай матчынай мовы.

Пра неабходнасць беражлівага стаўлення да слова і хрысціянскай веры, да багатых культурных традыцый Беларусі і Прынёманскага краю, да таго бясцэннага скарбу, які пакінулі нам славутыя продкі, пра ўвагу да запаветаў неўміручых класікаў у сваёй віншавальнай прамове выказаўся старшыня Вярэйкаўскага сельсавета Анатоль Казіміравіч Стасюкевіч *(на фота).* «Заслугоўвае ўвагі ідэя мастацтва, якое выконвае асветніцкую місію, заклікае не ў цемру сумніўных, чужых нам вобразаў і фантазій, а вядзе чалавека да святла непахісных ісцін і сапраўдных вечных каштоўнасцяў, – адзначыў кіраўнік. – Прыемна, што творчасць паэта Віктара Курловіча адпавядае такім высокім крытэрыям».





І сапраўды, прадстаўленыя ў ходзе юбілейнага творчага вечара вершы Віктара Курловіча, як і ўсё, што выходзіць з-пад яго пяра, можна па праве назваць прадметам мастацтва слова самай высокай якасці, як у плане формы, так і на ўзроўні ідэйна-тэматычнага зместу. Віктар Георгіевіч паходзіць з той плеяды прынямонскіх паэтаў, якія абралі ідэю патрыятызму, пафас народнасці ў якасці падмурку для сваёй творчай філасофіі. І на шчасце, сёння можна канстатаваць: гэтыя традыцыі паэтычнага мастацтва актыўна і паспяхова пераймаюцца, прыносяць плён – знаходзяць дастойны працяг у творах гродзенскіх паэтаў новага пакалення.

Разам з сакральнымі вобразамі Радзімы і матчынай мовы да ключавых вобразаў у лірыцы паэта Віктара Курловіча можна аднесці вобраз жанчыны. Натхнёны ён рысамі адзінай і непаўторнай музы – жонкі паэта Вольгі Мікалаеўны, поруч з якой рука аб руку паэт крочыць па жыцці ўжо амаль пяць дзесяцігоддзяў. Гады бягуць, а пачуцці гэтых сціплых, сталых людзей не губляюць сваёй светлай шчырасці, з бляскам вытрымліваюць усе выпрабаванні на трываласць. Праграму літаратурнага свята працягнула жонка і па сумяшчальніцтве муза паэта, а фактычна самы верны сябар, аднадумец і памочнік ва ўсіх справах, у тым ліку літаратурных. Вольга Мікалаеўна прачытала напісаны мужам у 2015 годзе, але дагэтуль так і не апублікаваны верш з грамадзянскай лірыкі.

Да праграмы свята зноў далучыліся маладыя чытальнікі і госьці-пісьменнікі. Людміла Кебіч, Дзмітрый Радзівончык і Мікалай Іваноўскі прачыталі ў гонар юбіляра свае паэтычныя творы на беларускай мове, падарылі Вярэйкаўскай школе, мясцовым дому культуры і бібліятэцы ўласныя кнігі з аўтарскімі аўтографамі на памяць. Потым былі яшчэ падарункі, кветкі, яшчэ вершаваныя радкі, апладысменты, шматлікія

віншаванні – ад дачок паэта-юбіляра, сяброў-аднавяскоўцаў; гаварылася яшчэ шмат цёплых, прыемных і правільных слоў. А ў падарунак ад гаспадароў урачыстасці прагучаў запіс цудоўнай песні «Гімн Вярэек» на словы Віктара Курловіча. Супрацоўнікамі дома культуры была падрыхтавана выстава персанальных кніг Віктара Георгіевіча і калектыўных выданняў з яго ўдзелам. Дэманстраваліся памятныя фотаздымкі паэта. Падумалася: калі ўсё пералічанае вышэй не называць светлым, шчаслівым імгненнем жыцця сціплага чалавека, таленавітага творцы, не лічыць новым радасным святам (незалежна ад яго назвы), то ці варта ўвогуле паняццю свята далей знаходзіцца ў нашым ужытку?..

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** шчаслівыя імгненні юбілейнай творчай вечарыны члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэта Віктара Курловіча. Аграгарадок Вярэйкі, Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць. 14 лютага 2025 года.



Віктар Георгіевіч і Вольга Мікалаеўна



Падарункі і віншаванні юбіляру ад калег па СПБ


ЗВЯЗДА
ВЫДАВЕЦКІ ДОМ
ДИПЛОМ





Ля мікрафона старшыня ГрАА СПБ, Заслужаны дзеяч культуры Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч





Выступае паэт Дзмітрый Радзівончык



Словы віншаванняў юбіляру ад паэта-земляка і калегі па СПБ Мікалая Іваноўскага (Ваўкавыскі раён)





Ля мікрафона старшыня Вярэйкаўскага сельсавета Анатоль Казіміравіч Стасюкевіч



Вольга Мікалаеўна Курловіч, жонка, верны сябар і муза паэта



Творы паэта-юбіляра чытаюць яго юныя землякі





Словы віншаванняў ад дачок паэта




Курловіч
Віктар Георгіевіч





Дзмітрый Радзівончык і Віктар Курловіч
у доме, дзе жыве паэт-юбіляр



Віктар Курловіч і Людміла Кебіч




У аграгарадку Вярэйкі заўважана архітэктура ў стылі ампір



